

БІЗНЕСМЕН ПАДАРЫЎ ПІНСКУ АКАДЭМІЮ ФУТБОЛА 8

ЧАМУ БУЛЬБА ПАВІННА СТАЦЬ БРЭНДАМ? 12




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 ЧЭРВЕНЯ 2018 г. СЕРАДА № 111 (28727)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр:**

*«Галоўныя патрабаванні да бюджэту на 2019 год — яго збалансаванасць, абслугоўванне абавязацельстваў па дзяржаўным доўгу і забеспячэнне ўсіх сацыяльных выдаткаў. Пры гэтым мы не павінны павышаць падатковую нагрузку на рэальны сектар. Перад урадам стаіць задача комплекснай перапрацоўкі падатковага заканадаўства».*

## КОРАТКА

- **Мемарыяльны комплекс «Рыленкі» ў Дубровенскім раёне маркуюць адкрыць пасля рэканструкцыі 3 ліпеня 2019 года.**



- У Беларусі каля дзвюх тысяч хворых на гепатыт С ужо ўключаны ў праграму лячэння за кошт бюджэту.
- **У Расонскім раёне створаны заказнік мясцовага значэння «Нешчарда», яго плошча складае амаль 6,7 тыс. га.**
- У Лідзе 8 верасня чарговы раз пройдзе фестываль Lidbeer. Хэдлайнерам гала-канцэрта стане гурт «Ленінград», таксама на фестывальнай сцэне выступяць «Воплі Відаплясава».
- **У Наваполацку ўчора шукалі 39-гадовую мясцовую жыхарку, якая ўцякла з рэанімацыі. Каля 22.40 11 чэрвеня яна самавольна пакінула рэанімацыйнае аддзяленне Наваполацкай цэнтральнай гарадской бальніцы.**

■ Абітурыент-2018

# «НІ ПУХУ НІ ПЕР'Я»



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Гэтыя словы гучалі ўчора ва ўніверсітэцкіх аўдыторыях як ніколі часта. А ўсё вельмі проста — 12 чэрвеня ў краіне стартавала цэнтралізаванае тэсціраванне**

**Беларускую мову (а менавіта з тэста па роднай мове і распачаўся двухтыднёвы экзаменацыйны марафон) сёлета пажадалі здаваць каля 25 тысяч чалавек. Усяго пад правядзенне ЦТ у Беларусі задзейнічаны 41 пункт.**
**У БДУІРы пісалі тэст па беларускай мове ў гэты дзень 267 чалавек. Для іх у чацвёртым корпусе ўніверсітэта былі падрыхтаваны дзве вялікія аўдыторыі. 14 чэрвеня ў БДУІРы будуць здаваць рускую мову.**

## Знайдзі сябе ў спісах

На гадзінніку **9.40.** Абітурыенты актыўна падцягваюцца да пункта правядзення ЦТ. На ўваходзе іх сустракае памятка: «Твае дзеянні, абітурыент!»: «1. Знайдзі сябе ў спісах размеркавання па аўдыторыях. 2. Пры ўваходзе ў корпус прад'яві свой пропуск і пашпарт. 3. Здай рэчы (курткі, парасоны, рукзакі і сумкі) у гардэроб, размешчаны на цокальным паверсе. Абітурыентам забараняецца праносіць у аўдыторыі, дзе праводзіцца тэсціраванне, любыя прадметы, акрамя дакумента, які сведчыць асобу, пропуска і ручкі з чарнілам чорнага колеру».

Хтосьці прыходзіць на ЦТ адзін, кагосьці суправаджаюць да дзвярэй бацькі, каханы хлопец ці дзяўчына. Заўважаем купку маладых людзей, падыходзім, каб з імі пазнаёміцца. Высвятляецца, што дружнай кампаніяй на экзамен прыехалі аднакласнікі з жодзінскай гімназіі № 1, выпускнікі фізіка-матэматычнага класа: браты Андрэй і Мікіта Шапшукі, Захар Млынарчык і Ангеліна Сяліцкая (трое з іх — залатыя медалісты). Кажуць, што выбар беларускай мовы для іх быў цалкам натуральны, бо «яна нам бліжэй». Ніхто з іх не стаў падстрахоўвацца і здаваць яшчэ і рускую мову. Абсалютна відавочна, што маладыя людзі ўжо здзейснілі свой прафесійны выбар: усе нацэлены на паступленне менавіта ў БДУІР, але пакуль асцярожнічаюць. «Так, хацелася б трапіць на ФКСіС, бо гэта найлепшы факультэт у свеце, але паглядзім, якія будуць балы», — смяецца Андрэй Шапшук.

СТАР. 5




# НЕ ВЕДАЮЧЫ БРОДУ...

## Каб купальны сезон не стаў апошнім у жыцці



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Спякотнае надвор'е з невялікімі тайм-аўтамі прахалоды, якое трывала ўсталявалася ў краіне яшчэ ў пачатку мая, спакушае на купанне ў вадаёмах. Ратавальнікі ўвесь час заклікаюць адпачываць на вадзе толькі ў дазволеных месцах — калі чалавеку стане дрэнна, то яго паспеюць своечасова выцягнуць з вады.**
**Цяпер у Таварыстве ратавання на водах працуюць у краіне 143 выратавальныя пасты, з іх 35 сезонных ды 108 пастаянных, і 66 выратавальных станцый. І гэта на больш чым 20 тысяч рэк і 10 тысяч азёр, не кажучы ўжо пра кар'еры. Зразумела, што да кожнага вадаёма вадалазаў на дзяжурства па графіку 24/7 не прыставіш, і таму застаецца шмат у чым спадзявацца на абачлівасць адпачывальнікаў.**

СТАР. 11

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, афарміўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# СЯБРОЎСТВА ЯК АСНОВА ДЛЯ БІЗНЕСУ

## Эканамічныя адносіны паміж Беларуссю і Індыяй варта развіваць больш рашуча

**Аб гэтым учора заявіў Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы са спікерам Лок Сабхі (ніжняй палаты) парламента Індыі Сумітрай Махаджан.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што рады гэтай сустрэчы, асабліва ў кантэксце саміту Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва: на яго палях беларускі лідар неаднойчы абмяркоўваў з прэм'ер-міністрам Індыі Нарэндрам Модзі адносіны двух дзяржаў, бакі намецілі перспектыўныя напрамкі.

«Ваш візіт у Беларусь — гэта ўмацаванне адносін кіраўніцтва Беларусі з кіраўніцтвам Індыі, — адзначыў Прэзідэнт. — І нам вельмі хацелася б, каб гэтыя палітычныя кантакты мелі пад сабой вельмі трывалую гандлёва-эканамічную аснову».

Беларускі лідар падкрэсліў: улічваючы адзінства меркаванняў Беларусі і Індыі па міжнародным парадку дня, улічваючы ўзаемавыгадную падтрымку двух дзяржаў у міжнародных арганізацыях — перш за ўсё ў ААН, — нам варта рухацца больш рашуча і актыўна ў развіцці эканамічных адносін, у сферы інвестыцый.

Паводле слоў Прэзідэнта, ёсць усе магчымасці для таго, каб перайсці ад простага гандлю да сумеснага інвеставання, стварэння сумесных прадпрыемстваў — як у Індыі, так і на тэрыторыі Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што калісьці ён прапанаваў Індыі стварыць адпаведны індустрыяльны парк на ўзор супрацоўніцтва з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Кіраўнік дзяржавы дадаў, што можна таксама выкарыстоўваць транспартна-лагістычныя магчымасці Беларусі для гандлю індыйскімі таварамі ў Еўропе ў цэлым, ва Усходняй Еўропе і рэгіёне ЕАЭС.

«Прапанова застаецца ў сіле, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Я ведаю, што ваш бок станоўча ўспрымае такія прапановы. Хацелася б, каб мы больш аператыўна пераходзілі на рэйкі будаўніцтва гэтага парка ў Беларусі».

«Улічваючы ролю парламента ў Індыі, я прасіў бы вас узяць пад сур'ёзны кантроль напрамак супрацоўніцтва вашай краіны з Беларуссю — і асабліва ў сферы інвестыцый», — дадаў беларускі лідар.

Суміра Махаджан адзначыла, што вельмі рада пабываць у Беларусі. Спікер ніжняй палаты парламента Індыі таксама дадала, што тут яна ўпершыню і ёй у нас вельмі падабаецца, і падзякавала Прэзідэнту за магчымасць наведаць нашу краіну.

«Нашы адносіны заснаваныя на сяброўстве, якое склалася гістарычна. І тая падтрымка, якую мы аказваем адно аднаму на міжнароднай арэне, — гэта, вядома, сімвал і знак нашага сяброўства, — адзначыла яна. — Але я таксама разумею, што адным сяброўствам сыты не будзеш. Таму трэба развіваць нашы гандлёва-эканамічныя адносіны, каб гэта было ўзаемавыгадна».

Індыйская парламенцкая дэлегацыя на чале са спікерам прыбыла ў Беларусь вечарам 9 чэрвеня, сёння днём яна пакіне нашу краіну. Як паведамляла «Звязда», днямі з гасцямі з Індыі сустрэліся старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл Мясніковіч, а таксама старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Андрэйчанка.

Праграма візіту ўключала наведванне ААТ «МТЗ», Парка высокіх тэхналогій, Беларуска-індыйскага вучэбнага цэнтра ў галіне інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій імя Раджыва Гандзі, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, а таксама Беларускага дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай вайны. Акрамя таго, дэлегацыя сустрэлася з прадстаўнікамі індыйскай абшчыны ў нашай краіне.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# ГАТОЎНАСЦЬ НУМАР АДЗІН

## Да правядзення Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы ўсё падрыхтавана

**Гэта канстатаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Учора ён сустрэўся з дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Рыгорам Рапотам.**

Прэзідэнт адзначыў, што гэтая тэма мімаходзь абмяркоўвалася ў Кітаі, падчас сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным на палях саміту Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. «Мы канстатавалі той факт, што ўсё гатова да правядзення ВДС», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар пацікавіўся ў Рыгора Рапоты, ці ўзнікалі ў працэсе ўзгаднення парадку дня нейкія праблемы. Прэзідэнт дадаў, што хоча быць у курсе ўсяго, што звязана з ВДС.

Дзяржаўны сакратар расказаў, што парадак дня сапраўды сфармуляваны і падрыхтаваны. Аднак існуюць некаторыя пытанні, якія, магчыма, запатрабуюць увагі прэзідэнтаў Беларусі і Расіі — Рыгор Рапота прапанаваў абмеркаваць іх падчас двухбаковых сустрэч ці ў нейкім іншым фармаце.

13 чэрвеня ў Маскве адбудзецца пасяджэнне Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы, а 19 чэрвеня ў Мінску запланавана пасяджэнне Вышэйшага дзяржаўнага савета. У парадак дня пасяджэння Саўміна ўключана каля 15 пытанняў, у парадак дня ВДС — каля дзесяці.

Пазней у размове з журналістамі Рыгор Рапота расказаў, якія аспекты будуць разглядацца на пасяджэнні ВДС. «Скажам, бюджэтныя пытанні ў нас заўсёды разглядаюцца, праграма ўзаемадзеяння ў галіне знешняй палітыкі, — адзначыў ён. — Заўсёды ў нас з'яўляецца прадметам разгляду перспектыва развіцця Саюзнай дзяржавы».

Акрамя таго, бакі абмяркуюць вынікі беларуска-расійскага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва за мінулы год.

Дзяржаўны сакратар дадаў, што ў парадак дня ўключана новая праграма ваеннай дактрыны Саюзнай дзяржавы. На яго думку, гэтае пытанне, якое патрабуе ўвагі прэзідэнтаў, ужо адпрацавана на ўзроўні ваенных ведамстваў.

Яшчэ адно пытанне, якое будзе абмяркоўвацца падчас ВДС, — гэта заснаванне новай прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне навукі і тэхнікі. «Рашэнне аб гэтым будзе прымацца на ўзроўні двух прэзідэнтаў, — адзначыў Рыгор Рапота. — Калі яно будзе прынята, то ўжо з 2019 года мы пачнём уручаць прэмію Саюзнай дзяржавы ў галіне навукі і тэхнікі. Гэта акрамя прэміі ў галіне літаратуры і мастацтва, якая будзе традыцыйна ўручацца ў рамках Саюзнай дзяржавы».

Таксама журналісты пацікавіліся ў дзяржаўнага сакратара, што робіцца па пытанні адмены роўмінгу на прасторы Саюзнай дзяржавы.

Паводле яго слоў, тут ёсць натуральная супярэчнасць: вытворца хоча прадаць любы тавар даражэй, а спажывец — купіць танней. «Нельга ламаць рынак, які склаўся, адным махам без уліку інтарэсаў усіх бакоў. Зразумела, што вырашаць гэтую задачу трэба, міністэрствы гэта разумеюць, і ніхто не адмаўляецца. Яны ўзялі нейкі тайм-аўт для прапрацоўкі непасрэдна з гульцамі на гэтым рынку. Цяпер разгляд гэтага пытання на такой стадыі», — дадаў Рыгор Рапота.

Пры гэтым ён падкрэсліў: працэс пастаянна трымаецца на кантролі.

Яшчэ адно пытанне журналістаў датычылася кантролю на беларуска-расійскай мяжы. Дзяржаўны сакратар нагадаў, што асноўная праблема заключаецца ў перасячэнні мяжы грамадзянамі трэціх краін, а не Беларусі ці Расіі. Паводле яго слоў, для вырашэння гэтай задачы і рыхтуецца пагадненне аб узаемным прызнанні віз, якім займаюцца міністэрствы замежных спраў.

Нагадаем, зараз падпісана пагадненне аб узаемным прызнанні віз, але толькі на перыяд правядзення чэмпіянату свету па футболе ў Расіі ў 2018 годзе і II Еўрапейскіх гульняў у Беларусі ў 2019-м. Рыгор Рапота адзначыў, што вопыт гэтага пагаднення будзе ўлічаны пры падрыхтоўцы новага дакумента.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

■ Парламенцкі дзённік

# СТАЎКА НА ПРАМКААПЕРАЦЫЮ

**У Беларусі з афіцыйным візітам знаходзіцца парламенцкая дэлегацыя Узбекістана на чале са старшынёй Сената (верхняй палаты) Олій Мажліса Нігмацілой Юлдашавым.**

Учора з высокімі гасцямі сустрэліся прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў і кіраўнікі Нацыянальнага сходу Беларусі. Пасля перагавораў у Савеце Рэспублікі быў падпісаны Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж верхнімі палатамі парламентаў Беларусі і Узбекістана.

Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч назваў сустрэчу з узбекскімі калегамі вельмі змястоўнай і канструктыўнай. «Мы фактычна прапрацавалі ключавыя пагадненні, якія плануецца вынесці на разгляд кіраўнікоў дзяржаў падчас будучага афіцыйнага візіту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ва Узбекістан, папярэдне ўзгодненая дата якога — 13—14 верасня 2018 года», — паведаміў журналістам спікер верхняй палаты беларускага парламента.

На сустрэчы ў Савеце Рэспублікі былі дэталёва разгледжаны пытанні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. «Мы разглядалі разам са спадаром Юлдашавым не толькі пытанні звычайнага гандлю, але, як патрабуе ад нас кіраўнік дзяржавы, пытанні інвестыцыйнага супрацоўніцтва, асабліва тыя, што датычацца прамкааперацыі, — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. — Гаворка пра сумесную вытворчасць сельскагаспадарчай тэхнікі, ёсць папярэднія дамоўленасці пра стварэнне вытворчасці дарожна-будаўнічай тэхнікі «Амкадора».

«Вялікае значэнне мы надаём рабоце нашага БЕЛАЗа ва Узбекістане, — дадаў старшыня Савета Рэспублікі. — Летась мы паставілі туды 109 машын, 35 — у першым квартале сёлета. Актыўна ўключыўся ў работу наш трактарны завод, і мы спадзяёмся, што аб'ёмы тут будуць павялічаны мінімум у паўтара раза».

Узбекскія парламентарыі выказалі зацікаўленасць у супрацоўніцтве ў фармацэўтычнай галіне. У выніку перагавораў была падпісана профільная дарожная карта, якая прадугледжвае стварэнне на Узбекістане некалькіх сумесных прадпрыемстваў па вытворчасці лекавых прэпаратаў. Удалося дасягнуць дамоўленасцяў па супрацоўніцтве ў кандытарскай сферы.

Шырокае кола пытанняў — ад гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва да турызму і культурнай сферы — было абмеркавана падчас сустрэчы старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзіміра Андрэйчанкі са старшынёй Сената Олій Мажліса Узбекістана Нігмацілой Юлдашавым. Спікер ніжняй палаты беларускага парламента заклікаў узбекскага калегу да больш актыўнага парламенцкага супрацоўніцтва, у прыватнасці Уладзімір Андрэйчанка прапанаваў стварыць групу дружбы паміж двума парламентамі. Прапанова была падтрымана.

Таксама парламентарыі закранулі тэму кантактаў у міжнародных арганізацыях. Гаворка ішла аб удзеле ў найбліжэйшай Парламенцкай асамблеі АБСЕ, што адбудзецца ў ліпені гэтага года ў Берліне. Беларусь да яе рыхтуе рэзалюцыю аб развіцці лічбавай эканомікі. Уладзімір Андрэйчанка прапанаваў узбекскаму боку падтрымаць яе, як гэта ўжо зрабілі амаль два дзясяткі краін, такія як Вялікабрытанія, Германія і іншыя.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Вераніка ПУСТАВІТ** ■

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ПРАЙШЛА ГІСТАРЫЧНАЯ СУСТРЭЧА ТРАМПА І КІМ ЧЭН ЫНА



На востраве Сентоса ў Сінгапуры прайшла гістарычная сустрэча лідараў Злучаных Штатаў і Паўночнай Карэі. Нягледзячы на ўзаемныя абвінавачанні ў мінулым і надзвычай напружаныя адносіны паміж краінамі, Дональд Трамп і Кім Чэн Ын правялі перагаворы і падпісалі выніковы дакумент. У ходзе мерапрыемства найвышэйшы кіраўнік КНДР і прэзідэнт ЗША некалькі разоў выйшлі да прэсы і паспелі шматкроць паціснуць адзін аднаму рукі падчас сумеснага фатаграфавання.

### СОТНІ НЕ ДАПУШЧАНЫХ У ІТАЛІЮ БЕЖАНЦАЎ ПРЫНЯЛА ІСПАНІЯ

Іспанскія ўлады абвясцілі, што гатовыя прыняць выратавальнае судна «Акварыус» з 629 мігрантамі на борце, якое завярнулі назад каля берагоў Сіцыліі. Прэм'ер-міністр Іспаніі Пэдра Санчэс, які ўзначаліў урад краіны менш за два тыдні таму, распарадзіўся адкрыць для выратаваных бежанцаў порт Валенсіі. «Гэта наш абавязак — пазбегнуць гуманітарнай катастрофы і прапанаваць гэтым людзям бяспечны порт», — адзначаецца ў заяве, распаўсюджанай канцылярыяй іспанскага прэм'ера. «Акварыус» амаль на суткі затрымаўся ў Міжземным моры, пасля таго як новы міністр унутраных спраў Італіі Матэа Сальвіні адмовіўся пускаць яго ў порт.

### ПАДЧАС ТРАГЕДЫІ НА ВОЛЗЕ ЗАГІНУЛІ 11 ЧАЛАВЕК

У выніку сутыкнення баржы і прагулачнага катамарана ў акваторыі Волгі загінулі адзінаццаць чалавек. Пяць чалавек выратаваны. Трое з іх шпіталізаваны. Трагедыя разгулялася позна ўвечары за 250 метраў ад берага паблізу грузавога порта Варашылаўскага раёна Валгаграда. Баржа літаральна падмяла пад сябе катамаран. Людзі апынуліся ў вадзе. Як паведамляюць СМІ, уладальнік катамарана, які ў момант аварыі быў за штурвалам, не меў дазволу на правоз пасажыраў, а плаўсродак рухаўся з выключанымі габарытнымі агнямі. На месцы здарэння працавалі каля 1,4 тысячы чалавек. Узбуджана крымінальная справа.

### UBER НАВУЧЫЦЦА ВЫЗНАЧАЦЬ П'ЯНЫХ ПАСАЖЫРАЎ

Паведамляецца, што вызначэнне стану чалавека будзе адбывацца з дапамогай штучнага інтэлекту. У прыватнасці, сістэма будзе ўлічваць хуткасць набору тэксту карыстальнікам, дапушчаныя ім памылкі, дакладнасць пападання на кнопкі, а таксама тое, як кліент трымае сам тэлефон: ці не губляе ён яго. Сістэма будзе сінхранізавацца з праграмай Uber і адпраўляць кіроўцу папярэджанне, калі паводзіны кліента незвычайныя. У кампаніі папярэдзілі, што адпаведная сістэма распрацоўваецца не для таго, каб шаферы адмаўляліся ад нецвярозых кліентаў. Праграма будзе накіроўваць да «спецыфічных» кліентаў кіроўцаў, якія маюць адпаведны вопыт з такімі пасажырамі. Таксама нецвярозым у залежнасці ад іх стану змогуць адмовіць у карыстанні паслугай.

■ Падрабязнасці

# Як атрымаць жыллёвую субсідыю?

## Сярэдні памер безнаяўнай жыллёвай дапамогі ў I квартале года — 6,7 рубля

**Як мы ўжо паведамлялі, у пачатку чэрвеня Прэзідэнт падпісаў Указ № 225, пашырыў катэгорыі грамадзян, якія могуць атрымаць безнаяўныя субсідыі на аплату паслуг ЖКГ. Згодна з дакументам, ужо ў жніўні ім будзе аказана дадатковая дапамога дзяржавы. Каму гэтая субсідыя прызначана і як яе аформіць?**

### Дапамогу атрымаюць без заявы

Да апошняга часу права на субсідыю па **выяўляльным** прынцыпе мелі адзінокія і непрацуючыя пенсіянеры і інваліды. Цяпер права на субсідыю атрымалі яшчэ грамадзяне, **якія даглядаюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў, дзяцей-інвалідаў да 18 гадоў, інвалідаў I групы або старых 80 і больш гадоў, і якія атрымліваюць сацыяльныя дапамогі на гэтыя мэты.** Прычым, атрымальнікам не спатрэбіцца збіраць даведкі, кудысьці хадзіць — налічваецца і падаўжаецца субсідыя аднолькава. Усю інфармацыю ў АРІП падасць Мінпрацы і сацабароны са сваіх актуальных баз. Суму матэрыяльнай падтрымкі чалавек проста ўбачыць у жыроўцы за жнівень. Субсідыя па гэтым прынцыпе налічваецца тэрмінам на тры месяцы. Аднак яна, пры выкананні неабходных умоў, працягваецца аўтаматычна.

### Куды звяртацца і з чым?

Змяняецца, у бок павелічэння, і колькасць атрымальнікаў субсідый па заяўляльным прынцыпе. Падаць заяву ў выканкам могуць грамадзяне або сем'і, якія не маюць уласнага жылля і пражываюць на здымных кватэрах альбо ў інтэрнаце прыватных прадпрыемстваў. Калі чалавек у арандаваным жыллі або інтэрнаце зарэгістраваны па месцы жыхарства і яго выдаткі на паслугі ЖКГ пры нарматыўным іх спажыванні перавышаюць 20 % сярэднямесячнага сукупнага даходу сям'і ў горадзе і 15 % — у сельскай мясцовасці, то ён мае права звярнуцца ў мясцовы выканкам для налічэння субсідыі.

Гэтым і астатнім катэгорыям сем'яў неабходна звярнуцца ў выканкамы па месцы жыхарства з пакетам дакументаў, паведамляе партал камунальнай адукаванасці gkx.by. Па-першае, гэта заява на атрыманне субсідыі (узор дадуць у выканкаме). Затым ідзе пашпарт (ці іншы дакумент, які сведчыць асобу), працоўная кніжка, пасведчанне аб нараджэнні дзіцяці (для тых, у каго ёсць дзеці да 18 гадоў), аб заключэнні або скасаванні шлюбу (пры наяўнасці), пенсійнае пасведчанне або пасведчанне інваліда (калі ёсць у сям'і). Лічы, асноўным дакументам стане паперка, якая пацвярджае даходы ўласніка жылля і членаў сям'і за шэсць месяцаў (даведка аб зарплаце, дапамогах, даходах ад прадпрымальніцкай дзейнасці і іншае).

Субсідыя, налічаная ў гэтым выпадку, выдаецца на шэсць месяцаў. Для падаўжэння субсідыі неабходна звярнуцца ў выканкам па месцы жыхарства з пашпартам, заявай і дакументамі пра даход.

### На якія камунальныя паслугі даецца субсідыя?

Сума дзяржпадтрымкі ў кожным выпадку вызначаецца індывідуальна і датычыцца толькі платы за асноўныя камунальныя паслугі пры нарматыўным іх спажыванні. Субсідуецца плата за газ, ваду, цяпло, капітальны рамонт, уборку месцаў агульнага карыстання, вываз смецця, тэхнічнае абслугоўванне жылога дома і ліфта, электраэнергію, у тым ліку і выдаткі



на электраэнергію для асвятлення пад'ездаў і работы ліфтаў. Максімальны тэрмін разгляду заявы — да 20 дзён.

У першым квартале гэтага года падалі заяву на субсідыю і атрымалі яе 925 хатніх гаспадарак на суму амаль 50 тысяч рублёў. У асноўным гэта маці-адзіночкі, шматдзетныя сем'і і пенсіянеры. Сярэдні памер безнаяўнай жыллёвай субсідыі ў I квартале года — 6,7 рубля.

### Хто не атрымае дзяржадапамогу?

Безнаяўную жыллёвую субсідыю не атрымае ўласнік кватэры, у якой зарэгістравана прыватнае прадпрыемства. Дапамогу апрыёры не атрымае гаспадар жылля, які здае яго па дагаворы найму, а таксама ўласнік некалькіх жылых памяшканняў (выключэнне — шматдзетныя сем'і).

А яшчэ з пачатку наступнага года субсідыі не будуць давацца грамадзянам, якія ўключаны ў спіс працаздольных, але не занятых у эканоміцы. Гэтае правіла не распаўсюджваецца на членаў сям'і непрацуючага грамадзяніна, якія пражываюць разам з ім.

Прыпыніць выплату субсідыі могуць, калі ўласнік памяняў месца жыхарства (аформіць дапамогу можна па новым адрасе) або падаў недакладную інфармацыю аб даходах. Акрамя таго, ад налічэння дзяржпадтрымкі можна адмовіцца, напісаўшы заяву ў службу субсідавання выканкама.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Грошы

# Майская дэфляцыя

**Прадукты ў мінулым месяцы патаннелі на 0,6 %, а паслугі падаражэлі на 0,1 %.**

Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў маі ў параўнанні з красавікам склаў 99,7 %, са снежнем 2017 года — 102,5 %, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Базавы індэкс спажывецкіх цэн, які выключае змяненне цэн на асобныя тавары і паслугі, схільныя да ўплыву фактараў адміністрацыйнага і сезоннага характару, у маі ў параўнанні з красавіком склаў 99,96 %, са снежнем 2017 года — 101,6 %. Такім чынам, кошты на тавары і паслугі ў мінулым месяцы ўпалі на 0,3 %. У маі харчовыя тавары патаннелі на 0,6 %, а нехарчовыя — на 0,03 %. Паслугі падаражэлі ў маі на 0,1 %, а з пачатку года — на 4,8 %. Пры гэтым за студзень — май харчовыя тавары выраслі ў цане на 1,7 %, а нехарчовыя — на 1,9 %.

# «Здавайце валюту»

**Насельніцтва больш за два гады застаецца чыстым прадаўцом наяўнай валюты. Прычым у маі чысты продаж яе вырас на 18 % да красавіка і склаў 234,7 млн долараў. Менавіта такія лічбы фігуруюць у матэрыялах Нацбанка.**

За пяць месяцаў гэтага года нашы грамадзяне здалі 863,9 млн долараў чыстымі, за ўвесь мінулы год — 2,2 млрд долараў, у 2016 годзе чысты продаж склаў больш за 2,4 млрд долараў. Суб'екты гаспадарання ў студзені — маі былі чыстымі пакупнікамі валюты (аб'ём куплі перавысіў продаж на 425,8 млн долараў).

Сам рост чыстага продажу адбыўся за кошт павелічэння здачы валюты на 12,2 % у маі да красавіка да 710,1 млн долараў, купля валюты вырасла на 9,5 % — да 475,4 млн долараў. Напярэдадні летняга сезона грамадзяне традыцыйна павялічваюць сваю актыўнасць на валютным рынку, купляючы і прадаючы валюту ў адпаведнасці з адпускнымі планамі. Ужо трэці год беларусы больш прадаюць валюту, чым купляюць. У тым ліку выдаткоўваецца валюта з назапашаных дэпазітаў у імкненні захаваць звыклае спажыванне.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Сезон

# «Клубніцы зараз — самыя смачныя!»

**У гэтым аўтарытэтна запэўніваюць спецыялісты Лунінецкага раённага спажывецкага таварыства. Масавы нарыхтоўчы сезон на салодкія ягады па прагнозах будзе доўжыцца прыкладна да сярэдзіны наступнага тыдня. Варта нагадаць, што калі летась закупляць ягады ад насельніцтва пачалі фактычна з 10 чэрвеня, дык сёлета яны пайшлі на два тыдні раней.**

— Мы нарыхтавалі ўжо больш за 150 тон клубніц, — расказала **эканаміст раённага спажывецкага таварыства Аксана САЙКО**. — З іх каля васьмі тон так званых адборных таварных ягад, якія пайшлі на рэалізацыю на рынках у Слуцку, Салігорску і Мінску, а таксама ў гандлёвую сетку сталіцы.

Таварныя і дробныя таварныя клубніцы зараз прымаюць ад насельніцтва ад 60 капеек да 1,2 рубля за кілаграм. Буйныя ягады ідуць да 2,5 рубля, вельмі буйныя — даражэй за гэтую лічбу. Але пераважна закупачныя цэны вагаюцца ад 1,8 да 2,2 рубля за кілаграм. Для кансервавых прадпрыемстваў ягады набываюць па 50 капеек, для вінаробства — па 30 капеек за кілаграм. Але ягад апошняй катэгорыі вельмі мала, зазначыла Аксана Сайко. Падчас сухога надвор'я яны не даходзілі да нарыхтоўшчыка, паколькі карыстаюцца ў пакупнікоў найбольшым попытам, напрыклад для вырабу варэння.

Як заўсёды, на жаль, не абышлося без умяшання «нябесный канцылярыі». Штогод ягады то залівае, то сушыць. Вось і ў панядзелак у Лунінецкім раёне прайшлі дажджы, але, як кажуць людзі, клубніцы паспелі згарэць. Але ж шмат даспела і ў добрай якасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## РЭКОРДНЫЯ ПРАПАНОВЫ

У краіне налічваецца амаль 70 тысяч вакансій

**Па даных Мінпрацы і сацабароны, на пачатак чэрвеня ў краіне не хапала 69,9 тысячы работнікаў. Месяц таму патрэба ў кадрах была на чатыры тысячы меншая. Зноў у попыце рабочыя прафесіі — 64 працэнты ад агульнай колькасці вакансій.**

Узровень зарэгістраванага беспрацоўя па рэспубліцы захоўваецца на адзнацы 0,5 %. У Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцях ён складае 0,6 %, у Гродзенскай — 0,5 %, у Мінскай — 0,4 %, у сталіцы — 0,2 %. Каэфіцыент напружанасці на рынку — 0,3 беспрацоўнага на адну вакансію.

З пачатку года ў дзяржаўную службу занятасці па садзейнічанне ў працаўладкаванні звярнулася 82,8 тысячы чалавек. З іх 55 тысячам падабралі работу. На перанавучанне за студзень — май адправілі амаль 3,3 тысячы грамадзян. На новае месца жыхарства і працы перасялена 64 сям'і.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

## МАЛАНКА ПАДПАЛІЛА ХЛЕЎ

**Ад навальнічнага разраду ў Мастоўскім раёне загарэлася гаспадарчая пабудова.**

Пра здарэнне на тэрыторыі прыватнага домаўладання ў вёсцы Нацкава стала вядома ўдзень. Гаспадар 1962 года нараджэння выйшаў на двор і стаў сведкам таго, як маланка ўдарыла ў дах хлява, і той загарэўся. Падраздзяленні МНС, якія прыбылі, ліквідавалі пажар і абаранілі ад агню размешчаны за некалькі метраў побач жылы дом.

Ратавальнікі нагадваюць, што для засцярогі ад падобных праяў сіл прыроды рэкамендавана абсталёўваць свае дамы сістэмай маланкааховы. Гэтыя работы выконваюць спецыялізаваныя арганізацыі. У новых дамах такая ахова прадугледжана каштарыснай дакументацыяй.

Летась, па інфармацыі Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС, з-за ўдараў маланкі ў вобласці адбылося 15 пажараў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## САМАЛЁТ ПАЙШОЎ НА АВАРЫЙНУЮ

**У Гродзенскім раёне адбылася аварыйная пасадка лёгкаматорнага самалёта. Па інфармацыі МНС, два чалавекі пацярпелі.**

Здарэнне мела месца непадалёку ад вёскі Каробчыцы, дзе аварыйную пасадку здзейсніў Zlin 42M 1975 года выпуску. Пілот выбраўся з транспартнага сродку самастойна, пасажыру спатрэбілася дапамога ратавальнікаў.

Работнікі МНС, выкарыстаўшы спецыяльны інструмент, дэблакавалі мужчыну. Абодва пасля агляду брыгадай хуткай медыцынскай дапамогі былі шпіталізаваны. Самалёт дэфармаваны. Паветраны борт дыслацыраваўся на аэрадроме «Кароліна» і належаў авіятару-аматару. Згодна з папярэдняй інфармацыяй, самалёт здзейсніў пробны палёт у раёне абласнога аэраклуба. Прычыны аварыйнай пасадкі ўстанаўліваюцца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



112.by

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні старшыні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Паўлу Уладзіміравічу Калауру ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю МАЦІ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Калауру Паўлу Уладзіміравічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні Паўлу Уладзіміравічу Калауру, старшыні Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# Беларускае малако зноў адправіцца ў Расію

## Рассельгаснагляд дазволіць пастаўляць прадукцыю ў абмен на дакументы аб правядзенні лабараторнага маніторынгу



Фота БелТА.

**Чарговы канфлікт, які звязаны з пастаўкамі беларускай малочнай прадукцыі ў Расію, пачынае сціхаць. Сітуацыя разгортвалася па сцэнарыі класічнай псіхалогіі: адмаўленне, гнеў, торг, дэпрэсія і прыняцце. З-за таго, што такія канфлікты здараюцца з пэўнай прадказальнасцю, да іх магчыма было б ужо прывыкнуць. Але менавіта іх цыклічнасць дэманструе, што дамоўленасці ў рамках ЕАЭС працуюць усё яшчэ неэфектыўна, а пра свабодны доступ на адзіны рынак для «пяцёркі» гаварыць пакуль складана. Пра тое, чаму беларускую прадукцыю зноў палічылі небяспечнай, дзе хаваецца пратэкцыянізм і калі малочныя рэкі Беларусі зноў пацякуць у Расію, — падрабязна ў матэрыяле.**

### ЗНОЎ ПРАТЭКЦЫЯНІЗМ?

З 6 чэрвеня Рассельгаснагляд забараніў пастаўкі малочнай прадукцыі з нашай краіны ў тары больш за 2,5 літра. У спісе абмежаванняў былі адзначаны сухое малако і вяршкі — канцэнтраваныя, кансерваваныя і згушчаныя, малочная наліўная сыроватка, канцэнтраваная і сухая, а таксама сыроватачны канцэнтрат і малочны бялок. У Рассельгаснаглядзе паведамілі, што рашэнне аб абмежаванні было прынята ў сувязі з «пастаўкамі небяспечнай малочнай прадукцыі з Рэспублікі Беларусь у Расійскую Федэрацыю». Пры гэтым прадукцыю ў тары з меншым аб'ёмам палічылі бяспечнай.

**Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Леанід ЗАЯЦ** ацаніў такое абмежаванне як неаб'ектыўнае і нічым не абгрунтаванае. Ён падкрэсліў, што малочная прадукцыя краіны праходзіла чарговую праверку ў лабараторыі напярэдадні ў сувязі з нядаўнім канфліктам. Тады парушэнняў не было выяўлена. Згаданая сітуацыя, па словах міністра, расцэньваецца як «чарговы пратэкцыянісцкі крок», дзякуючы якому адбываецца закрыццё доступу на рынак Расіі для айчыннай прадукцыі.

«Беларусь пастаўляе расійскім спажыўцам якасны прадукт. Ідзе жорсткі лабараторны кантроль на ўсіх этапах — ад вытворчасці сыравіны да адгрузкі прадукцыі. Гатовы прадукт даследуецца ў акрэдытаваных лабараторыях. Мы гарантуем, што наш прадукт бяспечны», — падкрэсліў міністр.

У сваю чаргу **член Калегіі (міністр) па тэхнічным рэгуляванні ЕЭК Валерый КАРАШКОЎ** накіраваў ва ўрад Расіі зварот, у якім заявіў аб неабходнасці адклікаць рашэнне Рассельгаснагляду па беларускай малочнай прадукцыі. Ён падкрэсліў, што ўвядзенне гэтых абмежаванняў парушае пункт 5 артыкула 58 раздзела 11 Дамовы аб Еўразійскім эканамічным саюзе, згодна з якім дзяржавы — члены ЕАЭС маюць права ўводзіць часовыя ветэрынарныя або ветэрынарна-санітарныя меры толькі тады, калі ёсць пагроза ў частцы эпізаатычнага дабрабыту тэрыторыі краіны саюза.

### ПЕРАМОВЫ Ў МАСКВЕ

Для ўрэгулявання пытання беларуская дэлегацыя на чале з міністрам сельскай гаспадаркі і харчавання Леанідам Зайцам накіравалася ў Маскву. Там прайшлі перагаворы з новым **кіраўніком Мінсельгаса Расіі Дзмітрыем ПАТРУШАВЫМ,** які заявіў, што гатовы садзейнічаць пераадоленню цяжкасцяў у пытаннях супрацоўніцтва.

«Нас аб'ядноўвае адзіная эканамічная прастора, што спрыяе павышэнню цікавасці да ўзаемнага гандлю сельгаспрадукцыяй. Але існуе шэраг пытанняў, якія патрабуюць павышанай увагі», — заявіў Дзмітрый Патрушаў.

Пасля заканчэння пасяджэння міністры даручылі кампетэнтным службам дзвюх краін стварыць рабочую групу, разабрацца ў сітуацыі, якая склалася, і разгледзець пытанне зняцця часовых абмежаванняў. Беларускі бок таксама прасіў аб правядзенні дадатковых кансультацый з Рассельгаснаглядам для абмеркавання пытанняў, што ўзнікаюць на тэхнічным узроўні.

Акрамя таго, на сустрэчы абмяркоўваліся пытанні інтэграцыі беларускай інфармацыйнай сістэмы «AITS-Нагляд» з расійскай федэральнай дзяржаўнай інфармацыйнай сістэмай «Меркурый». Таксама закранулі ход рэалізацыі плана мерапрыемстваў па працэдуры зняцця ўзаемных абмежавальных мер па пастаўках прадукцыі жывёлагадоўлі на 2018 год.

### АБМЕЖАВАННІ ЗДЫМУЦЬ ДАРОЖНАЙ КАРТАЙ?

Па выніках перагавораў абодва бакі падпісалі «дарожную карту» аб зняцці ўзаемных абмежаванняў па пастаўках малочнай прадукцыі. Паводле інфармацыі прэс-службы Рассельгаснагляду, у ёй прапісаны асноўныя мерапрыемствы, якія ў хуткім часе ўрэгулююць сітуацыю з абмежаваннямі пастаўкі прадукцыі прадпрыемстваў Расіі і Беларусі.

У дакуменце вызначаны тэрміны і ўмовы, пры выкананні якіх Рассельгаснагляд зможа адмяніць часовыя абмежаванні на пастаўкі прадукцыі шэрагу беларускіх прадпрыемстваў. Адной з такіх умоў з'яўляецца тое, што беларускі бок павінен падаць дакументы аб правядзенні лабараторнага маніторынгу па групах рызыкі, якія вызначаны Рассельгаснаглядам. У сваю чаргу, ведамства з 11 чэрвеня аднавіла права экспарту малочнай прадукцыі для трох беларускіх прадпрыемстваў: Баранавіцкага малочнага камбіната, Ляхавіцкага малочнага завода і Беллакта.

### ...А АСАДАЧАК ЗАСТАЎСЯ

Цікавы той факт, што, па звестках ЕЭК, расійскія вытворцы не забяспечваюць патрэбнасці ўнутранага рынку. Дэфіцыт сырога малака ў Расіі складае каля 7 млн т. Пры гэтым больш за 4 млн т малака завозіцца з Беларусі і каля 3 млн т — з трэціх краін.

Тым часам у нашай краіне працягваюць арыентаваць малочную прадукцыю на азіяцкі рынак. Цырымонія падпісання камерцыйных кантрактаў беларускіх кампаній з кітайскімі партнёрамі адбылася ў рамках візіту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Цындаа.

Мяса-малочная кампанія дамовілася з карпарацыяй Cofco Group на пастаўку ў Кітай у 2018 годзе сухога малака на суму да 30 млн долараў.

Таксама, па словах **дырэктара Нацыянальнага цэнтра маркетынгу і кан'юнктуры цэн Валерыя САДОХІ,** Беларусь зацікаўлена пашырыць сваю прысутнасць на малочным рынку В'етнама. Пра гэта ён заявіў падчас Беларуска-в'етнамскага дзелавога форуму.

Цяпер В'етнам развівае ўласную малочную вытворчасць, аднак імпарт расце з улікам пастаяннага павелічэння насельніцтва краіны. Пры гэтым краіна забяспечвае сябе малочнымі прадуктамі толькі на 20 %, а 80 % увозіцца з-за мяжы. Па словах Валерыя Садохі, В'етнам закупляе штогод ад 50 тыс. т да 90 тыс. т сухога малака.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

---

■ Тэндэнцыі

# БУЙНЫЯ КРАМЫ «ПАЙШЛІ» Ў РЭГІЁНЫ

## А Ў СТАЛІЦЫ З'ЯВІЦЦА НОВЫ ФАРМАТ — МЕГАМОЛЫ

**Апошні год для сталічнага рытэйлу можна назваць прарыўным, паколькі на рынак выйшла адразу тры буйныя гандлёвыя цэнтры. На падыходзе яшчэ адна не менш буйная тройка. Атрымліваецца, што патэнцыял для развіцця ў сталіцы для сучаснага гандлю яшчэ ёсць. Але ёсць і альтэрнатыўнае меркаванне: «Каб выжыць, гандлю варта накіроўвацца ў рэгіёны». Аб магчымых перспектывах развіцця гандлю расказвае кіраўнік гандлёвага сектара «Твая сталіца. Кіраванне праектамі» Арцём ДАВІДОВІЧ.**

### Новы ўзровень рытэйлу

— Калі казаць пра сітуацыю ў цэлым, то рынак камерцыйнай нерухомасці ў нашай краіне развіваецца хвалямі, — расказвае кіраўнік сектара. — Першае сур'ёзнае ўзрушэнне адбылося падчас сусветнага эканамічнага крызісу 2007—2008 гадоў. Цяпер рынак хутчэй знаходзіцца на ўздыме — мы адышлі ад апошніх узрушэнняў, цэны на гандлёвыя плошчы стабілізаваліся і нават трохі растуць. Яшчэ летась цэны намецілі станоўчую дынаміку, а вакантнасць у гандлёвых цэнтрах паступова ліквідуецца.

Лепш за ўсё гэтыя змены чытаюцца на сталічным рынку, дзе знаходзіцца ўвесь бізнес і абарачаюцца найбольшыя грашовыя патокі. Так, за год увяліся і запоўніліся такія вядомыя праекты-даўгабуды, як Galleria Minsk, Dana Mall і Green City. Пра якасць кожнага з гэтых аб'ектаў можна весці доўгую дыскусію, але правальных праектаў сярод іх няма. Гэта новы для краіны ўзровень рытэйлу; маштаб, якога дагэтуль ні ў Мінску, ні тым больш у рэгіёнах не было.

### Кліента трэба здзіўляць

Нягледзячы на пазітыўную тэндэнцыю на рынку, будаваць цяпер няпроста. Выраслі цэны на будматэрыялы, існуе высокая канкурэнцыя, ёсць пытанні па крэдытаванні. Пасля таго як будзе ўведзена ў эксплуатацыю наступная партыя буйных праектаў (ГЗЦ Palazzo, Minsk City Mall і DiaMond City), на рынку цалкам верагодна з'явіцца новы фармат — мегамолы. Дэвелаперы выйдуць за МКАД, дзе больш прасторы, няма праблем з паркоўкай і ў работу можна ўзяць вялікі ўчастак. Такі фармат даўно выкарыстоўваецца на Захадзе, ёсць прыклады ў нашых суседзяў у Кіеве і Маскве. Гэта буйныя гандлёва-забаўляльныя цэнтры з пераважным забаўляльным складнікам.

Увесь свет сыходзіць ад звыклага фармату гандлёвых цэнтраў, паколькі гандаль пад уздзеяннем інтэрнэту паступова выцясняецца ў анлайн. Рытэйл накіраваны на імпульсіўныя пакупкі, а таму галоўная мэта — максімальна доўга затрымаць спажыўца на аб'екце з дапамогай забаўляльнага сегмента, фудкорта і ўнікальнай прапановы. У Амерыцы штогод зачыняюцца дзясяткі аб'ектаў, якія не захацелі ці не змаглі трансфармавацца пад патрэбы сваіх кліентаў. Людзі пайшлі туды, дзе цікавей, па новыя адчуванні, яркія ўражанні і камфортнае баўленне часу.

Сёння, каб затрымаць кліента, недастаткова проста мець цікавую гандлёвую плошчу, неабходна здзіўляць. У якасці прыкладу возьмем тое, як будуецца ў Мінску ГЗЦ Palazzo. Аб'ект пазіцыяніруе сябе як першы забаўляльны комплекс у Беларусі, дзе будуць кінатэатр фармату IMAX, аэратруба, дарожкі для кёрлінга і гэтак далей. Для нашага рынку гандлёвай нерухомасці гэта сур'ёзная заяўка.

### Першыя «ластаўкі» ў абласцях

Што датычыцца рэгіёнаў, то і там азначыліся сур'ёзныя перамены. Услед за сталіцай у абласцях актыўна развіваецца сфера рытэйлу. Мінск перанасычаны прапановай, таму многія накіраваліся туды, дзе супрацьстаянне меншае, канкурэнцыя слабейшая, а ніша незакрытая, — у рэгіёны. Тутужо пачалі з'яўляцца аб'екты досыць высокага ўзроўню, напрыклад TRINITI ў Гродне ці ARMADA PLAZA ў Магілёве.

Тая ж гісторыя з сеткавымі аператарамі. Вялікая колькасць кампаній падрыхтоўвае свае планы развіцця на год, а то і на два. Тыя, хто закрыў сваю патрэбу ў Мінску, разглядаюць прапанову за яго межамі — у абласных цэнтрах і іншых буйных гарадах. Гэта правіла жыцця — калі ты не развіваешся, то цябе «з'ядуць» канкурэнты.

Трэба больш актыўна працаваць з рэгіёнамі, таму што там вялікі патэнцыял і гатоўнасць рынку гэты патэнцыял рэалізоўваць. Таму сёння сталічныя эксперты прапануюць сябе ў якасці своеасаблівага моста паміж інвестарам і аператарамі. Іх вопыт працы з аб'ектамі самага рознага ўзроўню, веданне гульцоў рынку і трэнды ў сферы гандлёвай нерухомасці дазваляюць пралічваць хады далёка наперад, каб аб'ект не проста «стрэліў», але і працаваў на працягу дзесяцігоддзяў.

### Шаблоны не працуюць

Да «начынкі» кожнага аб'екта трэба падыходзіць індывідуальна. Дзесьці спрацуе адзін пул арандатараў, дзесьці зусім іншы. Трэба ўлічваць патэнцыял пляцоўкі, характарыстыкі аб'екта, вывучаць моцныя і слабыя бакі праекта. Часам трэба ўмешвацца ў архітэктуру будынка, змяняючы планіроўкі, вертыкальныя камунікацыі ці шырыню калідораў з пункту гледжання сучасных пераваг як сеткавых аператараў, так і канчатковых спажыўцоў. Натуральна, больш магчымасцяў для змен і прасторы для манеўру ў любога праекта застаецца на ранніх стадыях рэалізацыі.

Часта дэвелаперы сутыкаюцца з дэфіцытам аператараў і не могуць самастойна знайсці арандатараў на свае гандлёвыя плошчы, не ведаючы, як гэта правільна рабіць. Выбіраць трэба такіх экспертаў, якія працуюць з большасцю сецівкоў, ведаюць планы кампаній па развіцці на год наперад і могуць фарміраваць найбольш эфектыўныя звязкі — аб'екты, якія будуць працаваць.

Напрыклад, летась сталічныя спецыялісты вельмі якасна спрацавалі па гандлёвым цэнтры «Еўрапарк» у Слуцку. На момант, калі ўласнік звярнуўся па дапамогу, ім быў самастойна запоўнены першы паверх мясцовымі індывідуальнымі прадпрымальнікамі, але з другім паверхам з'явіліся праблемы. Рытэйл-аператар падкарэктаваў планіровачныя рашэнні і змог цалкам запоўніць другі паверх да адкрыцця.

Цяпер эксперты дапамагаюць увесці маштабны праект ARMADA PLAZA ў Магілёве. Ёсць (пакуль безназоўны) буйны гандлёвы цэнтр у Салігорску.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# «НІ ПУХУ НІ ПЕР'Я»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ангеліна адзіная з кампаніі, хто будзе здаваць на ЦТ чатыры дысцыпліны: вырашыла здаць яшчэ і англійскую мову. «Але спадзяюся, што ўсё будзе добра, і я нацэлена ў першую чаргу на фізіку і матэматыку», — канстатуе дзяўчына. Фізіка — традыцыйна самая складаная для ўсіх абітурыентаў дысцыпліна. У адзінаццацікласнікаў першай жодзінскай гімназіі яе выкладала Эла Мікалаеўна Якубоўская, таму можна замахнуцца і на ФКСіС.

## Такое не ўскрыеш непрыкметна

Запускаць абітурыентаў у корпус распачалі рана. І ў **10.00** аўдыторыі ўжо пачалі запаўняцца. На ўваходзе ў пункты правядзення ЦТ усе абітурыенты праходзяць строгі фэйскантроль: арганізатары супастаўляюць фота ў дакументах, так бы мовіць, з «арыгіналам». Перад аўдыторыяй абітурыенты праходзяць яшчэ адзін пашпартны кантроль і цягнуць нумар свайго месца. Ад яго будзе залежаць і варыянт тэста.

Каб асабіста пераканацца ў тым, што ўсё арганізавана належным чынам, у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі завітаў **старшыня Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, намеснік прэм'ер-міністра Васіль ЖАРКО.**





Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Прыкладна ў **10.40** на вачах у журналістаў арганізацыйная камісія разам з прадстаўнікамі Камітэта дзяржкантролю адчыніла запячатаны сейф, куды ў сем гадзін раніцы былі змешчаны матэрыялы цэнтралізаванага тэсціравання. Гэта значыць, што члены дзяржкамісіі заступілі на сваё дзяжурства сёння яшчэ раней — усё робіцца толькі ў іх прысутнасці. Дастаўкай усіх экзаменацыйных матэрыялаў па краіне займаюцца кур'еры фельд'егерскай службы, якой давяраюць дыпламатычную перапіску і дзяржаўныя сакрэты. Для гэтага выкарыстоўваюць апламбаваныя сумкі накшталт інкасатарскіх. Усім прысутным дэманструецца захаванне на пакетах з бланкамі адказаў і педагагічнымі тэстамі цэласнасці ахоўнай стужкі. Такія пакеты проста немагчыма ўскрыць непрыкметна, скажам, на шляху ад сейфа да аўдыторыі. Як толькі цэласнасць стужкі парушаецца, на ёй праступаюць схаваныя да вачэй сімвалы. Да таго ж на кожным пакеце ёсць ярлычок, дзе нанесеныя нумар і штрых-код, што дазваляе ідэнтыфікаваць пакеты пры іх вяртанні з пунктаў тэсціравання ў Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў. Бланкі адказаў вырабляюцца на фабрыцы Дзяржзнака, маюць ступені ахоўы такія, як на грашовых знаках, і з'яўляюцца дакументамі строгай справаздачнасці, таму цалкам выключаецца магчымасць іх фальсіфікацыі.

Хм... ня, каб нават падазрэнняў ні ў кога не ўзнікла. Увогуле, у параўнанні з папярэднімі гадамі колькасць парушальнікаў правіл правядзення ЦТ істотна зменшылася, хоць раней, напрыклад, у БДУІРы былі выпадкі, калі ў абітурыентаў выяўлялі мікранавушнікі. А вось аматараў «расставіць крыжыкі» ў бланку адказаў наўздагад заўсёды хапае. Некаторыя ўдзельнікі ЦТ па фізіцы і матэматыцы здаюць свой бланк ужо праз 10 хвілін пасля пачатку экзамену. На пытанне «А падумаць не хочаш? Навошта тады прыйшоў на ЦТ?» арганізатары чуюць у адказ: «Так мая маці захацела»...

Улічваючы, як развіваецца сучасная тэхніка, у многіх краінах на іспытах ужо забараняюць наручныя гадзіннікі. У нас пакуль гэтага не робяць. Але ў кожнай экзаменацыйнай аўдыторыі на сцяне вісіць вялікі гадзіннік. Гэта агульнае патрабаванне для ўсіх аўдыторый, дзе праходзіць цэнтралізаванае тэсціраванне, таму асабліва патрэбы ў наручных гадзінніках няма, і, калі ў арганізатараў узнікне падазрэнне, яны могуць прапанаваць абітурыенту здаць сваё прыстасаванне на час экзамену.

На кожную аўдыторыю запаўняецца акт, у якім пазначана не толькі колькасць бланкаў, але і іх нумары, таму чужыя бланкі апынуцца ў пакеце не могуць. Да таго ж і арганізатары ЦТ у аўдыторыі пацвярджаюць сваім подпісам, што менавіта гэты бланк знаходзіўся ў экзаменацыйнай аўдыторыі.

Акадэмію ўрачыста адкрылі ў 2014 годзе. Тут беражліва захоўваюць відэазапіс цырымоніі адкрыцця. Вось што сказаў Аляксандр Зарыбка за мінуту да перарэзання сімвалічнай стужкі: «Я і мая жонка нарадзіліся ў Пінску. Мы памятаем, што на гэтым месцы знаходзілася пустка, дзе мы з хлопцамі гулялі ў футбол. Мне пашчасціла займацца футболам у дзяцінстве. Дзякуй майму трэнеру Уладзіміру Шумарыну, што выхаваў мой характар і прывіў дух сумленнасці і сяброўства ў нашай камандзе. Хачу сказаць маладым футбалістам: вы заўсёды будзеце памятаць трэніроўкі, паездкі на спаборніцтвы, забітыя і прапушчаныя галы, перамогі і паражэнні. У вас ёсць шанц стаць сапраўднымі людзьмі і дасягнуць значных поспехаў у спорце і жыцці».

Пра фундатара спартыўнага аб'екта тут гавораць не толькі з пачуццём падзякі, але і з вялікай павагай. Паводле слоў Міхаіла Кабрынца, Аляксандр Міхайлавіч — чалавек надзвычай сціплы, ён не любіць свяціцца на тэлебачанні, амаль не дае інтэрв'ю. У родны горад часта прыязджае да маці, цікавіцца спартыўнымі поспехамі юных футбалістаў, наведвае сваё дзецішча. На стадыі будаўніцтва ён тут бываў пастаянна, многія нюансы ўзгадняў з архітэктарамі, прарабамі, майстрамі. А калі, напрыклад, ехаў на адкрыццё Акадэміі, не забыўся прыхапіць падарункі для сталых трэнераў, ветэранаў гарадскога футбола.

— Для заняткаў усё ёсць, нам застаецца адпавядаць, — разважае дырэктар школы. — Сёння мы набіраем дзяцей з сямі гадоў, цяпер займаецца 37 груп на бюджэтнай аснове. Ёсць адна група платная, куды бацькі прыводзяць шасцігадовых дзяцей. Год мы да іх прыглядаемся, а налета, калі ёсць жаданне дзіцяці і заўважаныя здольнасці да заняткаў спортам, пераводзім у бюджэтную групу. Зараз займаецца 500 навучэнцаў. Спартыўны комплекс таксама аказвае платныя паслугі. Вечарам тут трэніруюцца дарослыя. Многія каманды, у тым ліку з краін-суседак, праводзяць у нас зімовыя зборы.

**Старшыня Пінскага гарадскога Савета Лявонцій ЛЕМЯШЭЎСКІ** адзначыў:

— Пінск вядомы сваімі спартыўнымі дасягненнямі. Наш горад выхаваў такіх вядомых ігракоў зборнай, як Віталь Кутузаў, Сяргей Балановіч, Андрэй Астроўскі, Сяргей Ясковіч, Алег Страхановіч і іншыя. Мы імі ганарымся. Але яшчэ больш важным уяўляецца тое, што тут займаюцца сотні іншых хлопчыкаў, якіх мы адарвалі ад камп'ютараў, якія вучацца таварыскасці, калектывізму, загартоўваюць сваё цела і дух. Хай нават яны не стануць знакамітымі спартсменамі, але стануць людзьмі, бо футбол выхоўвае. Пройдзе яшчэ нейкі год, і абавязкова прывяду сюды свайго ўнука... Усе пінчукі ўдзячныя земляку за цудоўны спартыўны аб'ект.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*г. Пінск.*


**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении 18 июля 2018 г. открытого аукциона по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка, необходимого для обслуживания не завершенного строительством жилого дома в частную собственность в Чернинском сельсовете Брестского района**

| № лота | Предмет аукциона | Местоположение объекта | Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) | Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством не законсервированный жилой дом в виде капитального строения наружной площадью 138 кв. м, готовностью основного строения 10 % и земельный участок с кадастровым номером 121285002101000179 площадью 0,1505 га для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | д. Братылово, ул. Пригородная, 29 | 11000, в том числе: 2639,34 – начальная цена не завершенного строительством жилого дома; 8195,89 – начальная цена земельного участка; 164,77 – сумма расходов на оценку стоимости не завершенного строительством жилого дома | 1100 | 1. 73,50 – затраты на регистрацию участка; 2. оплата объявлений по актам выполненных работ |

По улице Пригородной в деревне Братылово проходят сети газоснабжения, электрификации, имеется подъездная гравийная дорога.

Аукцион будет проводиться 18.07.2018 в 10.00 по адресу: Брестский район, аг. Черни, ул. Пионерская, 16 (здание сельисполкома).

Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Чернинского сельского исполнительного комитета № BY95AKBB36410000003051000000, филиал 100 ОУ «АСБ Беларусбанк» г. Брест, БИК AKBBBY21100, код платежа – 04901 задатка в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения, осуществляется победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в течение десяти рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Председатель комиссии по организации и проведению аукциона обеспечивает осмотр предмета аукциона претендентом на участие в аукционе в любое согласованное ими время в течение установленного срока приема заявлений.

Для проведения аукциона необходимо наличие не менее двух участников в отношении предмета аукциона.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: аг. Черни, ул. Пионерская, 16 (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений – 12 июля 2018 года до 17.00.

Контактные телефоны: 94 31 35, 94 31 36.



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Организатор торгов:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 47-20-56.
**Продавец:** ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей», 210002, г. Витебск, ул. М. Горького, 62, тел.: (029)896-47-55, (029) 714-50-17, alex-68.06@mail.ru.

| Наименование объекта, начальная цена, задаток |
|---|
| Лот № 1. Машина сновальная (СП-180), инв. № 143961, г. в.1986. Нач. цена: 1260 руб. без НДС. Задаток: 126 руб. |
| Лоты № 2, 3. Трансформатор силовой марки ТМЗ1000, инв. № 141363, 141364, г. в. 1967. Нач. цена за 1 лот: 1820 руб. без НДС. Задаток за 1 лот: 182 руб. |
| Повторные торги состоятся 29.06.2018 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: с 13.06.2018 с 8.30 по 28.06.2018 до 17.30. Шаг аукциона устанавливается в сумме 5 % от начальной цены лота. **Условия:** оплата НДС сверх цены продажи имущества. В случае перечисления денежных средств в иностранной валюте комиссия по конвертации и переводу валюты осуществляется за счет покупателя. Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 24.10.2017, 16.11.2017, 09.12.2017, 30.01.2018, 15.02.2018, 02.03.2018, 03.04.2018 |

Задаток перечисляется: р/с № BY70BLBB30120300082525001001 (бел. руб.); BY43BLBB30120300082525001002 (USD); BY16BLBB30120300082525001003 (EUR); BY86BLBB30120300082525001004 (RUB) в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской обл., BIC BLBBBY2X, УНН 300082525. Получатель платежа: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей». Задаток за участие в аукционе резидентами Республики Беларусь осуществляется в белорусских рублях, нерезидентами – в иностранной валюте с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа. Валюта торгов – белорусский рубль. Шаг аукциона устанавливается в сумме 5 % от начальной цены лота. Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. №415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 дней со дня проведения торгов: возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов и НДС в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты их проведения. Ознакомление с имуществом осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Объекты находятся по адресу: г. Витебск, ул. М. Горького, 62. Имущество, выставляемое на торги, бывшее в употреблении. С полной информацией о порядке проведения торгов, оформления участия и определения победителя аукциона можно ознакомиться на сайте www.marketvit.by. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63.

# ЯК ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ АД ЭНТЭРАВІРУСА

**Мінулым летам шмат перапалоху нарабіў вірус Каксакі, які распаўсюджваўся ў Турцыі. Некаторыя ў паніцы нават адмаўляліся ад паездак у гэту краіну. Здавалася, з'явіўся нейкі новы энтэравірус. Аднак гэта зусім не так. Энтэравірусы, з таго часу, як у 60-х гадах мінулага стагоддзя былі адкрыты амерыканскімі вучонымі, вельмі добра вывучаны. Дарэчы, менавіта летам мы часцей, чым у іншую пару года, сутыкаемся з імі. Чым небяспечная гэта немач?**



## Ад каго і дзе можна заразіцца?

— Штогод летам і ў пачатку восені адбываецца некаторы пад'ём захваральнасці энтэравіруснай інфекцыяй, — расказвае **загадчык 3-га педыятрычнага аддзялення 3-й Гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Людміла КІПЦЭВІЧ.** — Пад гэтай назвай сабрана вялікая група вірусных хвароб, якія выклікаюць энтэравірусы групы Каксакі і ЕСНО. Інфекцыі характарызуюцца разнастайнасцю клінічных праяў — ад лёгкіх ліхаманкавых з'яў да цяжкіх менінгітаў.

Усяго існуе 71 тып энтэравірусаў, якія распаўсюджаны ва ўсім свеце — у краінах Еўропы, Азіі, Амерыкі. Ад віду віруса эфектыўнасць лячэння не залежыць, кожны з іх лячыць дастаткова проста. Вакцына ад іх не распрацавана — зноў-такі гэта немэтазгодна з-за вялікай колькасці тыпаў. Самай цяжкай формай гэтай інфекцыі з'яўляецца энтэравірусны (серозны) менінгіт. Таксама варта памятаць, што энтэравірусная інфекцыя часцей хварэюць дзеці, чым дарослыя.

— Дзіцячы арганізм, у параўнанні з дарослым, усё ж недастаткова сфарміраваны, і гэта ў поўнай меры датычыцца імуннай сістэмы, — тлумачыць Людміла Кіпцэвіч. — У дзяцей адзначаецца больш блізкі кантакт адзін з адным, чым у дарослых. Да таго ж дзеці часцей, чым дарослыя ігнаруюць санітарныя правілы — не мыюць рукі перад ядой, не апалоскваюць садавіну і гародніну. У арганізаваных дзіцячых калектывах гэта таксама актуальна і часам прыводзіць да распаўсюджвання інфекцыі.

Энтэравірусы сустракаюцца ўсюды, яны ўстойлівыя ў знешнім асяроддзі і доўгі час могуць захоўвацца ў сцёкавых водах, плавальных басейнах, адкрытых вадаёмах, на прадметах і ў прадуктах харчавання — малацэ, садавіне, гародніне. Але вірус хутка гіне падчас прагравання і кіпячэння. Асноўны шлях яго перадачы — кантактна-бытавы. Інфекцыя распаўсюджваецца праз ваду і ежу, падчас размовы, кашлю, чхання ад хворага чалавека, праз брудныя рукі і дзіцячыя цацкі. Крыніцай інфекцыі з'яўляюцца хворыя людзі. Найбольш інтэнсіўна вірус выдзяляецца ў першыя дні хваробы. Успрымальнасць да яго вельмі высокая. Часта назіраюцца групавыя захворванні, магчымы сямейныя ўспышкі. Калі з'явіцца прыкметы вострай інфекцыі, звяртацца трэба да педыятра або тэрапеўта, а з цяжкім станам — да інфекцыяніста.

## Як распазнаць інфекцыю?

Захворванне пачынаецца востра — з павышэння тэмпературы да 38—39 градусаў. Яна трымаецца 3—5 дзён, пасля зніжаецца да нармальнай. Часам павышэнне тэмпературы хвалепадобнае — апускаецца і зноў паднімаецца. Пры павышэнні тэмпературы дзіця адчувае слабасць, санлівасць, часам галаўны боль, млоснасць, ірвоту.

Калі вірус паражае слізістую ротаглоткі, развіваецца энтэравірусная ангіна. Яна праяўляецца павышэннем тэмпературы, агульнай інтаксікацыяй (слабасць, галаўны боль, санлівасць) і наяўнасцю везікулярнага сыпу ў выглядзе пухіркоў, запоўненых вадкасцю, на слізістай ротаглоткі і міндалінах. Гэтыя пухіры лопаюцца, а на іх месцы ўтвараюцца язвачкі, запоўненыя белым налётам. Пасля выздараўлення на іх месцы не застаецца ніякіх слядоў.

Яшчэ адно наступства — з'яўленне экзантэмы — пачырванення скуры, як правіла, на верхняй частцы тулава — галаве, грудзях, руках. Часам везікулярны сып з'яўляецца на далонях і ступнях. Пухіркі праз 5-6 дзён знікаюць, не прарываючыся, а на іх месцы з'яўляецца ўчастак пігментацыі (карычневая кропка), якая знікае праз некалькі дзён.

— Нягледзячы на яркую клінічную карціну і выяўленасць праяў, цячэнне энтэравіруснай інфекцыі спрыяльнае, а ўскладненні сустракаюцца рэдка, — расказвае Людміла Кіпцэвіч. — Імунітэт пасля хваробы захоўваецца на працягу некалькіх гадоў. Але калі заразіцца новай разнавіднасцю энтэравіруса, праявы хваробы могуць узнікнуць зноў.

### Не грэбуйце правіламі гігіены

**Важна прытрымлівацца правілаў асабістай гігіены, выконваць пітны рэжым (ужываць кіпячоную ці бутыляваную ваду), старанна мыць садавіну і гародніну, праветрываць і выконваць вільготную ўборку памяшканняў. Таксама па магчымасці лепш пазбягаць масавага збору людзей. З любымі праявамі хваробы ні ў якім разе нельга дапускаць, каб дзіця наведвала арганізаваны дзіцячы калектыў.**

## Не прапусціць менінгіт

Найбольш цяжкай, але тыповай формай энтэравіруснай інфекцыі з'яўляецца серозны вірусны менінгіт — запаленне мазгавых абалонак. Захворванне пачынаецца востра, з пад'ёму тэмпературы да 39—40 градусаў. З'яўляецца моцны галаўны боль («галава расколваецца»), галавакружэнне, ірвота, часам болі ў жываце, спіне, у дзяцей можа ўзнікаць сутаргавы сіндром. Нярэдка назіраюцца катаральныя з'явы з боку ротаглоткі, верхніх дыхальных шляхоў, балючыя высыпанні на скуры, часта ў выглядзе плям розных памераў. Хворы становіцца абыякавы або млявы, затарможаным, або наадварот узбуджаны. Акрамя сутаргаў, ён можа адчуваць болі ў мышцах, жываце. І тут важна не прапусціць пачатак захворвання, пры першых прыкметах неабходна імклівая звяртацца па медыцынскую дапамогу, ні ў якім разе не займаючыся самалячэннем.

# Донарства стане бязвыплатным

**У Беларусі распрацоўваюцца змены ў закон аб донарстве крыві і яе кампанентаў, што дазволіць ужо да 2020 года перайсці на бязвыплатнае донарства. Мяркуецца, што парламентарыі прымуць новы законапраект ужо ў сярэдзіне наступнага года. Што пры гэтым зменіцца для донараў, расказалі спецыялісты.**

Згодна са статыстыкай, кожнаму 3-4 чалавеку ў свеце хоць раз у жыцці патрабуецца пераліванне крыві. Летась 95 тысяч беларусаў аддалі сваю кроў для выратавання жыцця іншага. Прычым 20 % донараў — маладыя людзі ва ўзросце да 30 гадоў. Штодзень каля дзвюх тысяч чалавек у нашай краіне здаюць кроў. Кожная чацвёртая данацыя — бязвыплатная. Аднак Сусветная арганізацыя аховы здароўя рэкамендуе, каб пераважная большасць данацый крыві была добраахвотнай, бязвыплатнай і рэгулярнай.

— За тры апошнія гады колькасць бязвыплатных донараў у нашай краіне вырасла ў восем разоў, — расказвае **дырэктар РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій, галоўны пазаштатны трансфузіёлаг Міністэрства аховы здароўя, кандыдат медыцынскіх навук Фёдар КАРПЕНКА.** — Ва ўсім свеце донарства ажыццяўляецца пераважна на бязвыплатнай аснове. І як паказвае практыка, брак крыві сярод бязвыплатных донараў значна меншы, чым сярод платных. Гэта сведчыць аб тым, што апошнія менш сочаць за сваім здароўем.

Як адзначае Фёдар Карпенка, 99 % донараў маюць альтруістычныя матывы, аднак у многіх разам з гэтым прысутнічае і зацікаўленасць у кампенсацыях. Новы закон не цалкам ліквідуе выплаты, а сфарміруе іх у поўны сацпакет. Донар замест грашовай выплаты атрымае набор прадуктаў, які дазволіць кампенсаваць энергазатраты ў прамежках паміж данацыямі. Гэта не адмяняе харчавання да і пасля данацыі, а таксама вызваленне ад работы. Сёння той, хто здае кроў, атрымлівае 92 рублі, а таксама два выхадных: адзін у дзень здачы, другі можна ўзяць у любы дзень. Гэтыя дні аплачваюцца з разліку сярэднядзённага заробку донара. Таксама донарам прапануюць харчаванне пасля здачы крыві.

Пры здачы кампанентаў крыві — плазмы і трамбацытаў — плануецца пакінуць выбар: або здаваць на бязвыплатнай аснове, або атрымаць грашовую кампенсацыю. Як заўважыў Фёдар Карпенка, калі донарскай крыві будзе не хапаць, неабходны аб'ём мяркуецца дабіраць на платнай аснове.

Плануецца ўвесці і дадатковыя льготы Ганаровым донарам. Каб атрымаць гэта званне, зараз неабходна здаць 20 данацый крыві або 40 данацый яе кампанентаў на бязвыплатнай аснове, або ўдвая больш — на платнай. Зараз Ганаровыя донары атрымліваюць устаноўленую заканадаўствам надбаўку да пенсіі, маюць права на адпачынак у любы зручны час, абслугоўваюцца ў арганізацыях аховы здароўя без чаргі, маюць першачарговае права на атрыманне санаторна-курортнага лячэння. Да гэтага плануецца ўвесці яшчэ 4-5 дадатковых сацыяльных гарантый. У прыватнасці, мяркуецца ўдасканаліць забеспячэнне лекавай і медыцынскай дапамогай, магчыма, для Ганаровых донараў будзе ўведзены бясплатны праезд да месца работы. Праўда, з увядзеннем новага закона стаць Ганаровым донарам можна будзе толькі здаючы кроў на бязвыплатнай аснове.

Як адзначыла **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы, доктар медыцынскіх навук Людміла МАКАРЫНА-КІБАК,** новы законапраект, акрамя падтрымкі значнасці бязвыплатнага донарства, забароніць рэалізацыю крыві і яе кампанентаў у іншыя краіны.

# АД СЭРЦА ДА СЭРЦА

## Пацыенты з трансплантаванымі органамі прадэманстравалі, што паўнавартаснае жыццё працягваецца

**Палацава-паркавы комплекс у Нясвіжы ў мінулую суботу стаў месцам збору не проста турыстаў і аматараў гісторыі, а ўдзельнікаў незвычайнай акцыі — «Ад усяго сэрца».**

Яе гасцямі сталі пацыенты з хранічнай сардэчнай недастатковасцю (ХСН) пасля розных відаў хірургічнага лячэння, у тым ліку пасля перасадкі сэрца, нырак і печані, а таксама кардыяхірургі і трансплантолагі, кардыёлагі і блізкія пацыентаў. Мерапрыемства прымеркавана да 10-годдзя транспланталогіі ў Беларусі.

Гасцей сустракалі рыцары і дзяўчаты ў гістарычных касцюмах, па паркавай алеі іх суправаджала калона з двух дзясяткаў байкераў, якія затым размясціліся на спецыяльнай пляцоўцы перад палацам і фатаграфаваліся з ахвотнымі. Каля варот палаца гасцей свята сустракалі народны ансамбль «Зараніца» Нясвіжскай дзіцячай школы мастацтваў і заслужаны аматарскі калектыў Беларусі «Тэатр імя Уршулі Радзівіл». Пасля афіцыйнага адкрыцця мерапрыемства, выступленняў урачоў і пацыентаў дырэктар клуба байкераў «Харлей Дэвідсан» Аляксей Адаранка ўручыў усім пацыентам майкі з лагатыпам акцыі «Ад усяго сэрца». Перад удзельнікамі выступілі дзіцячы тэатр песні «Хвілінка» ў суправаджэнні «Этнабалета» (Мінск), а затым гледачоў чакалі захапляльныя выступленні спартыўных гімнастаў, акрабатаў, фехтавальшчыкаў, прадстаўнікоў баявых майстэрстваў, рыцарскія баі і выступленні самадзейных калектываў Нясвіжа.

Паралельна ўсе ахвотныя атрымлівалі кансультацыі ўрачоў-кардыёлагаў, вымяралі артэрыяльны ціск, узровень глікеміі, ліпідны спектр, маглі памерыць абхват таліі і вызначыць індэкс масы цела. Пасля ўдзельнікаў чакаў майстар-клас па здаровым харчаванні і кулінарны майстар-клас для пацыентаў з ХСН. Падчас гутаркі з хворым і іх блізкім расказалі пра рацыянальнае і збалансаванае харчаванне, важнасць пітнога рэжыму, неабходнасць кантролю балансу вадкасці ў арганізме і карэкцыі масы цела. А на кулінарным семінары ўсе ахвотныя маглі прыгатаваць цікавыя стравы пад кіраўніцтвам шэф-повара і дыетолага з даступных і простых прадуктаў. Усім жадаючым дапамаглі скласці меню на тыдзень з улікам індывідуальных асаблівасцяў, абумоўленых ХСН.

А тых, у каго засталіся сілы, чакала дыхальная гімнастыка і аэробіка. Пад кіраўніцтвам спецыяліста пацыенты з хранічнай сардэчнай недастатковасцю II і III класаў сумесна з супрацоўнікамі лабараторыі ХСН і кардыяхірургамі вучыліся правільна выконваць зарадку. Пасля ўдзельнікам расказалі пра неабходнасць фізічнай актыўнасці з улікам індывідуальных асаблівасцяў і распрацавалі спецыяльныя праграмы, накіраваныя на развіццё фізічнага рэзерву і паляпшэнне кардыялагічнага профілю.

Згодна са статыстыкай, толькі 3 % жыхароў Еўропы ведаюць і могуць правільна вызначыць асноўныя сімптомы сардэчнай недастатковасці, астатнія прымаюць іх за прыкметы старэння арганізму. Такія акцыі прыцягваюць увагу да праблемы ХСН і трансплантalогіі, павышаюць дасведчанасць урачоў аб асноўных і новых кірунках у эфектыўным лячэнні, важнасці выяўлення ХСН на ранніх этапах, паляпшэнні якасці жыцця і зніжэнні смяротнасці ад гэтай паталогіі. Пацыенты ж усведамляюць, што ў нашай краіне наладжана аказанне высокакваліфікаванай медыцынскай дапамогі на любым этапе хваробы, важна толькі своечасова звяртацца да ўрача.

Сацыяльна-адукацыйная акцыя «Ад усяго сэрца» прайшла пад эгідай РНПЦ «Кардыялогія» і РНПЦ «Трансплантaлогіі органаў і тканак».

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

# Не заракацца... але лепей не трапляць, ці Як уладкаваны побыт у беларускіх турмах?

**Ніколі не заракайся ад торбы і турмы. Гэтая фраза набывае новы сэнс пасля таго, як пабываеш у адной з папраўчых устаноў. Хочацца крычаць: не заракайся, але зрабі ўсё магчымае, каб падобны вопыт ніколі не стаў рэальнасцю. Магчыма, гэта перспектыва здаецца не такой жахлівай, таму што ўяўленне пра знаходжанне ў турме складваецца па серыялах і музычных кампазіцыях пэўнага стылю. Мы паспрабуем выкрыць усе міфы і максімальна падрабязна расказаць пра ўклад жыцця ў папраўчых установах.**



## Спецвопратка з клімат-кантролем і стыльная мэбля з масіву

На «экскурсію» ў турму адпраўляемся разам з прадстаўнікамі грамадскага савета пры МУС. У яго склад уваходзяць вядомыя сваёй эфектыўнай дзейнасцю ў розных сферах дасведчаныя персоны. Тэме работы пенітэнцыярнай сістэмы ў гэтым кантэксце ўдзяляецца асаблівая ўвага. Гэтым разам члены савета пабывалі ў «Турме № 8» упраўлення Дэпартамента выканання пакаранняў МУС па Мінску і Мінскай вобласці, якая знаходзіцца ў Жодзіне. Менавіта гэтая папраўчая ўстанова была абрана нездарма: тут утрымліваюцца амаль усе катэгорыі спецкантынгенту, у тым ліку непаўналетнія, жанчыны, падследныя, тыя, хто адбывае турэмнае зняволенне, у тым ліку і пажыццёвае.



Пачынаем наш візіт у турму з самай эмацыянальна простай часткі — выставы прадукцыі, якую вырабляюць зняволеныя. Тры асноўныя кірункі, якімі яны займаюцца, — гэта дрэваапрацоўка, металаапрацоўка і тэкстыльная прамысловасць. На самай справе асартымент тавараў уражвае: ад камплектуючых вырабаў для сельскагаспадарчай тэхнікі да офіснай мэблі і прадуктаў харчавання. Да таго ж менавіта зняволеныя вырабляюць форменную вопратку, а таксама спецыяльныя шаўроны, якія выкарыстоўваюць практычна ўсе рэспубліканскія службы. А з мінулага года на базе адной з папраўчых устаноў Гомельскай вобласці пачалі шыць дзіцячую хакейную форму. У перспектыве ёсць магчымасць пачаць вырабляць і дарослую форму, і абмундзіраванне для прафесійных спартсменаў. Якасць прадукцыі настолькі высокая, што зараз вывучаецца пытанне рэалізацыі яе на экспарт. Асаблівую цікавасць выклікае мэбля з масіву, а таксама форма, якая ідэальна падыходзіць пад умовы надвор'я ў гарачым і вільготным клімаце.

Працоўны абавязак зняволеных вырашае адразу некалькі задач. Па-першае, дазваляе зарабіць, па-другое, хоць, хутчэй за ўсё, гэта самае галоўнае, — многім дапамагае атрымаць запатрабаваную спецыяльнасць, па якой яны змогуць працаваць пасля таго, як вызваляцца.

## Акно ў свет

На тэрыторыю рэжымных аб'ектаў мы праходзім па падземных калідорах — так пераменшчаюцца зняволеныя. Гэта неабходна, каб звесці да нуля спробы ўцёкаў.

Дзень у турме пачынаецца а 6-й раніцы. Пасля таго як ложак запраўлены, садзіцца, а тым больш класціся, на яго нельга да адбою. Выключэнне складаюць тыя, каму прапісаны пасцельны рэжым. Калі мы глядзелі на трансляцыю з камер відэаназірання, пра гэты факт яшчэ не ведалі. Вакол — ідэальны парадак. Некаторыя ўсё ж уладкоўваюцца за сталом, чытаюць кнігі, гуляюць у настольныя гульні. Кнігі ў камерах абнаўляюць кожны тыдзень, таму інтэлектуальны голад нікому не пагражае. Дарэчы, у некаторых камерах, калі дазваляюць умовы утрымання, можна ўсталяваць невялікі тэлевізар. Праўда, прагляд перадач строга ў адпаведнасці з графікам, з праграмы выключана ўсё, што магло б паўплываць на ўзровень агрэсіўнасці гледачоў. І, як акно ў паўсядзённае жыццё краіны, звыклы рытуал — штовячэрні прагляд «Панарамы».

Строгія правілы ў папраўчай установе распаўсюджваюцца на ўсё. Перасоўваецца спецкантынгент, як прынята тут гаварыць, толькі камерамі, таму ніякай магчымасці ўбачыць іншых асуджаных няма. Гэта асабліва важна, улічваючы, што ў турме могуць утрымлівацца падследныя, якія праходзяць па адной справе, таму неабходна спыніць паміж імі ўсякія зносіны.

Так што велізарнай агульнай сталовай, як паказваюць у фільмах, тут няма і быць не можа. Ежу па камерах разносяць у спецыяльных тэрмасах. Наша наведванне выпадае на дзень беларускай кухні. Таму ў асноўным абедзенным меню бульбяная запяканка, капуста са смятанай і салата з квашанай капусты. Акрамя таго, вязні і падследныя могуць рабіць заказы з буфета — прысмакі дастаўляюць раз на тыдзень. Рацыён для кожнага вызначаюць урачы-спецыялісты. Дарэчы, на тэрыторыі турмы знаходзіцца ўласная, добра абсталяваная бальніца. Тут у поўнай меры аказваюць дапамогу ўсім хворым.

У распарадку дня для зняволеных прадугледжаны штодзённы шпацыр. Ад 4 гадзін для цяжарных жанчын да 30 хвілін для асуджаных на пажыццёвае зняволенне. Праўда, прагуляцца ўсё роўна асабліва не атрымаецца: на вуліцы зняволеныя знаходзяцца ў прагулачных дворыках.

## «Што ж ты нарабіў?»

Пакуль мы ходзім па тэрыторыі турмы, тое, што адбываецца, нагадвае нешта нерэальнае. У кожнай з камер ёсць вочка, у якое можна заглянуць, побач — шыльды з кароткім апісаннем біяграфіі і злачынстваў асуджаных. Калі мы чуем, колькі забітых людзей прыпадае на ўсіх асуджаных на пажыццёвае зняволенне, становіцца не па сабе. І гэтыя людзі — праз сцяну, для іх такі расклад — штодзённасць. У адну з камер мы ўсё ж такі заходзім. Там утрымліваюцца непаўналетнія, якія знаходзяцца пад следствам.

— Што ж вы здзейснілі? — добразычліва пытаюцца члены савета.

— Падпалілі дзверы, — ціха, гледзячы ў падлогу, адказвае зусім юны хлопец. Ён выглядае настолькі бяскрыўдна, што здаецца, яго месца за першай партай з высока паднятай рукой, а ніяк не ў турэмнай камеры.

— Узрост?

— 15.

— Раней прыцягваліся?

— Не.

Аказваецца, і за бяскрыўдным выглядам могуць хавацца не лепшыя памкненні. Лёс юнака неўзабаве вырашыць суд, але, улічваючы абставіны, хутчэй за ўсё, прысуд будзе дастаткова мяккі. Галоўнае каб хапіла розуму зрабіць высновы на ўсё жыццё.

Яго «таварышы па няшчасці» выглядаюць не так сціпла. Адказваюць больш смела і нават рэзка. Як высвятляецца, у турме яны ўжо не першы раз. Напрыклад, адзін з іх, 16-гадовы хлопец, гэтым разам апынуўся ў папраўчай установе за тое, што скраў аўтамабіль ва ўласных бацькоў. Дарэчы, заняткі, як і экзаменацыйныя выпрабаванні, праводзяцца нават у турме.

Калі мы аказваемся ў корпусе, дзе жывуць члены атрада гаспадарчага абслугоўвання, кантраст падаецца істотным. Тут усё выглядае больш па-хатняму, на сценах нават вісяць дэкаратыўныя пано. Але, каб патрапіць у атрад, у які ўваходзяць работнікі харчаблока, лазнева-пральнага камбіната, раздатчыкі, прыбіральшчыкі, сталяры, сантэхнікі трэба ідэальна выконваць дысцыпліну. Кожны выпадак адміністрацыя разглядае ў індывідуальным парадку. Для многіх магчымасць выходзіць на работу за межы камеры становіцца істотным матыватарам для змены лініі паводзін.

## Паказаць рэальную карціну

Нават у якасці госця знаходзячыся ў будынку папраўчай установы, хочацца хутчэй з яго выйсці. Усё ж такі атмасфера тут цяжкая. Тым складаней зразумець людзей, якія, набыўшы доўгачаканую свабоду, зноў здзяйсняюць злачынства, не баючыся магчымасці яе страціць...



Завяршылася знаходжанне ў Жодзінскай турме пасяджэннем грамадскага савета пры МУС. Як адзначыў **начальнік Дэпартамента выканання пакаранняў Алег МАТКІН,** у аснове функцыянавання крымінальна-выканаўчай сістэмы павінен быць, наколькі дазваляе спецыфіка, прынцып адкрытасці: «Мы бачым, што ў грамадстве часам не зусім аб'ектыўна падаецца дзейнасць гэтай сістэмы. Я думаю, што праца савета ў гэтым кірунку дазволіць данесці яшчэ раз да грамадства рэальную карціну, пэўныя праблемы, якія існуюць».

Грамадскі савет пры МУС існуе ўжо пяць гадоў. Галоўная яго задача — дапамагаць выбудаваць канструктыўны дыялог паміж прадстаўнікамі МУС і грамадствам, а таксама даць аб'ектыўную ацэнку дзейнасці праваахоўнікаў. З лістапада 2017 года **савет узначальвае Павел ЯКУБОВІЧ.** Ён адзначыў, што менавіта выязныя пасяджэнні з'яўляюцца адной з самых эфектыўных формаў работы.

— Міністр папрасіў, каб члены савета ўдзельнічалі ў сітуацыях, якія звязаны з рэзанансімі справамі, што ўяўляюць грамадскі інтарэс. Такія тэмы трапляюць на старонкі газет, актыўна мусіруюцца ў інтэрнэце, на тэлебачанні. Але далёка не заўсёды ім даюцца аб'ектыўныя ацэнкі. Таму грамадскаму савету даручана ў вядомай ступені фарміраваць парадак дня, — зазначыў Павел Якубовіч.

Раз у месяц савет праводзіць прыём грамадзян, акрамя таго з яго прадстаўнікамі можна звязацца па тэлефоне. Сярод сваіх непасрэдных задач члены савета бачаць уплыў на лібералізацыю заканадаўства, супрацьдзеянне страшным грамадскім праблемам — п'янству, наркаманіі і бытавому насіллю, а таксама тэме сацыялізацыі асоб, якія вызваліліся з месцаў адбыцця пакарання. Гэтаму аспекту, як і дзейнасці пенітэнцыярнай сістэмы ў цэлым, падчас апошняга пасяджэння была ўдзелена асаблівая ўвага.

**Дар'я КАСКО.**

# НЕ ВЕДАЮЧЫ БРОДУ...



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## «У нас для адпачынку падрыхтавана 478 пляжаў»

— Нашы супрацоўнікі сумесна з Міністэрствам аховы здароўя і балансатрымальнікамі стараюцца зрабіць усё для бяспечнага знаходжання каля вады, — кажа **старшыня рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае рэспубліканскае таварыства ратавання на водах» Анвар ІГАМБЕРДЫЕЎ.** — У нас для адпачынку падрыхтавана 478 пляжаў. Большасць — у Брэсцкай і Віцебскай абласцях. Пляжы трэба рыхтаваць, ствараць інфраструктуру, чысціць іх ад смецця. Разам з тым мы сутыкаемся і з логікай кшталту «няма пляжа — няма праблемы». Але людзі купацца хочуць і проста палезуць у ваду, толькі зробяць гэта ў недазволеным месцы, дзе нашых пастоў няма.

— Пры падрыхтоўцы зон адпачынку да вясны па плане на вадасховішчах Мінскай лесапаркавай гаспадаркі ўстанаўлівалася пляжнае абсталяванне, — кажа **дырэктар УП «Мінская лесапаркавая гаспадарка» Павел БАГДАНЧЫК.** — Гэта ценевыя навесы, вулічныя спартыўныя трэнажоры, дзіцячыя гульнявыя комплексы, альтанкі, лаўкі і урны. Да таго ж на сталічных пляжах сёлета з'явілася 160 тапчаноў.

Не сакрэт, што многія адпачывальнікі прыязджаюць да вадаёмаў на веласіпедах. І калі раней паркоўкі для іх існавалі толькі на Цнянскім вадасховішчы, то сёлета яны з'явіліся і на Заслаўскім вадасховішчы, на Крыніцы і ў Драздах. Болей стала мангалаў і біятуалетаў.

## З кар'ерам не жартуюць

Пасля выпрацоўкі радовішчаў карысных выкапняў застаюцца вялікія і часта глыбокія ямы кар'ераў. Паступова яны запаўняюцца вадой — і так утвараецца возера. З двума вялікімі адрозненнямі. Па-першае, прыродны вадаём не быў выкапаны за некалькі гадоў, а ўтвараўся на працягу соцень, калі не тысяч гадоў. І берагі там куды больш трывалыя, чым у кар'ераў. Але тут можна запярэчыць — як жа так, ёсць прыклады, калі на штучных вадаёмах адпачываць дазволена. І цалкам справядліва можна спасылацца на Цнянскае вадасховішча або на Мінскае мора. Але, па-другое, пляжы на іх былі спраектаваны загадзя, а кар'ер — гэта проста яма з вадой, якая можа мець глыбіню ў дзясяткі метраў. Берагі асыплюцца — і чалавек трапіць самахоць у глыбокую магілу.

Напрыклад, у 2012 годзе ў Калінкавіцкім раёне дадому не вярнуліся два хлопчыкі. Маці аднаго з іх звярнулася ў міліцыю. Праз некалькі гадзін іх знайшлі ў пясчаным кар'еры. Абодва былі мёртвыя — іх засыпала пяском, і яны не паспелі выбрацца.

Яшчэ двух дзяцей засыпала ў 2014 годзе ў кар'еры каля вёскі Гатаўшчына Глыбоцкага раёна, што на Віцебшчыне. Пасля высветлілася, што пясок нечакана пачаў абсыпацца на плошчы каля 50 метраў. Двух хлопчыкаў 2002 і 2005 гадоў нараджэння, вучняў мясцовай школы, знайшлі на глыбіні восем метраў.

А ў кар'еры на мінскай вуліцы Гарэцкага ўжо ў чэрвені за два дні загінулі два чалавекі. Абставіны іх гібелі пакуль высвятляюцца.

## Сеў у лодку? Надзень камізэльку!

У цёплыя дні на вадаёмах можна сустрэць не толькі плыўцоў, але і тых, хто катаецца на лодцы. Здавалася б, усё лагічна — там, дзе катаюцца на лодках, лезці ў ваду не трэба. Стоячы за штурвалам, заўважыць купальшчыка немагчыма, не тое што паспець закласці манеўр і аб'ехаць яго.

— Яркі прыклад здарыўся ў 2016 годзе ў Барысаве, — кажа **начальнік Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь Міхаіл ЧАШУН.** — Кіроўца вёў гідрацыкл па ўсіх правілах, але нечакана перад ім вынырнуў купальшчык. Ён стукнуўся галавой у корпус гідрацыкла — і адразу пайшоў на дно.

Усяго ж у краіне налічваецца каля 330 тысяч маламерных суднаў — гідрацыклаў, маторных лодак, катараў, звычайных лодак і катамаранаў... Статыстыка гібелі на іх неадназначная. Так, з 2000 года ў краіне загінула амаль 1200 чалавек з-за парушэння правілаў карыстання гэтымі сродкамі. Але за апошні год лятальных выпадкаў было толькі дзевяць, хоць колькасць суднаў павялічылася з чатырох да 330 тысяч. Небяспека такіх здарэнняў у тым, што яны, як правіла, групавыя. Напрыклад, у ліпені 2013 года на возеры Белым у Жыткавіцкім раёне загінула ажно пяць чалавек.

— Усе, хто едзе на судне, мусяць знаходзіцца ў зашпіленых выратавальных камізэльках, — працягвае Міхаіл Чашун. — Яна каштуе зусім нядорага — 30—50 рублёў. І паверце, амаль за паўстагоддзя ратавальнікі не дасталі ніводнага патанулага, на якім была б гэтая самая камізэлька.

## Дзе забаронена купацца?

Маніторыць абстаноўку ў беларускіх вадаёмах Рэспубліканскі цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя. Самыя свежыя звесткі — на 8 чэрвеня. Такім чынам, на сёння абмежавана купанне дзяцей на 10 зонах рэкрэацыі. Сярод іх — пляжы «Цэнтральны» на рацэ Мухавец у Брэсце, на возеры Мяднянскім у Брэсцкім раёне, зона рэкрэацыі на возеры Рагазнянскім і пляжы санаторыя «Надзея» ў Жабінкаўскім раёне. У гомельскі топ-ліст трапілі адразу пяць пляжаў у межах абласнога цэнтра — «Каскад-1», «Каскад-2», «Валатоўскі», «Прудкоўскі» і «Заходні». Для дзяцей і дарослых абмежавана купанне на чатырох пляжах Магілёўшчыны, два з якіх знаходзяцца ў горадзе, а яшчэ два — каля вёсак Палыкавічы і Вільчыцы. Цалкам жа забаронена купанне на пляжы гарадскога парку Жабінкі.

## Крыху хронікі

Па стане на 11 чэрвеня ў краіне патануў 121 чалавек, з іх 10 непаўналетніх. Паспелі з вады выцягнуць 104 чалавекі, з іх 27 дзяцей. А вось папярэджанні атрымалі амаль 10 тысяч чалавек.

9 чэрвеня ў Мастоўскі раён на месца, дзе злучаюцца Нёман і Шчара, прыехалі парыбачыць двое мужчын са сваімі дзецьмі. Купацца там нельга, але гэта не спыніла малых. У нейкі момант яны пачалі тануць. Гэта заўважыў адзін з бацькоў і кінуўся на дапамогу. Дзеці абхапілі мужчыну за корпус, але... і яго самога зацягнулі пад ваду. Целы пасля дасталі вадалазы з Мастоўскай выратавальнай станцыі.

На мінулым тыдні ў Быхаўскім раёне 44-гадовы мужчына разам з 9-гадовай дачкой лавілі рыбу на затоцы і вырашылі акунуцца ў ваду. Бацька плыў наперадзе, дачка — услед за ім. І вось дзяўчынка прыкмеціла, што бацька пайшоў пад ваду і на паверхні не з'яўляецца.

Напалоханая дзяўчынка пачала клікаць на дапамогу. Да яе адправіліся мужчыны, якія лавілі рыбу непадалёк. Малую выцягнулі на бераг, думаючы, што ратаваць трэба яе. Але дзяўчынка прасіла ўратаваць не яе, а бацьку. Рыбакі зноў кінуліся ў ваду. Але вярнуліся адтуль ні з чым...

А ў Столінскім раёне ў мінулыя выхадныя 37-гадовы жыхар Барысава разам з братам і двума дзецьмі пераходзілі цераз раку Сцвіга. Дарослыя выпадкова аступіліся і трапілі ў падводную яму. Адзін з мужчын здолеў выбрацца і ўратаваць малых. Цела другога пазней знайшлі вадалазы. Адну з дзяўчынак даставілі ў рэанімацыю.

Даволі кур'ёзны выпадак адбыўся ў Рэчыцы 5 чэрвеня. Кампанія грамадзян Расіі прыехала адпачываць на берагу Дняпра на аўтамабілі. Трое з іх засталіся ў палатцы, а двое пайшлі ў машыну. І якраз у гэты момант яна і пачала свой рух. На шчасце, людзі паспелі выскачыць. Але аўто апынулася пад вадой. Вадалазы Рэчыцкай выратавальнай станцыі знайшлі машыну на глыбіні ў чатыры метры за 20 метраў ад берага.

Абставіны здарэння пакуль высвятляюцца, але Таварыства ратавання на водах нагадвае, што аўтамабіль мусіць быць прыпаркаваны не менш чым за 30 метраў ад вады. Акрамя таго, ён павінен стаяць на ручным тормазе.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Здарэнні

## ШКОЛЬНІКІ ПАЦЯРПЕЛІ АД БАЛОНЧЫКА І АГНЮ

**Ранкам ад дзяжурнай медсястры прыёмнага аддзялення Жлобінскай раённай бальніцы паступіла паведамленне аб шпіталізацыі хлопчыка 2002 года нараджэння.**

Высветлілася, што днём раней дзевяцікласнік і яго сябар, навучэнец 7-га класа, сабралі самаробны балончык з пнеўматыкі і вырашылі яго падарваць. Пасля падпалу кнота ёмістасць выбухнула проста ў руках старэйшага падлетка, у выніку чаго ён атрымаў частковую ампутацыю 1—4 пальцаў правай кісці, быў прааперыраваны і знаходзіцца ў рэанімацыйным аддзяленні бальніцы. У выніку выбуху пацярпелі яшчэ два падлеткі. Адзін атрымаўірваную рану сцягна, другі — ірваныя раны абодвух перадплеччаў. Пасля аказання медыцынскай дапамогі іх адпусцілі дадому.

* * *

А у дзвюх вёсках Гродзенскай вобласці дзеці атрымалі апёкі пры падобных абставінах — падчас спальвання смецця каля дома. Па інфармацыі Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС, абодва пажары здарыліся ў позні час сутак. У вёсцы Красноўцы Лідскага раёна хлопчык 2008 года нараджэння быў шпіталізаваны з апёкамі першай — другой ступені, атрымаными ў выніку неасцярожнага абыходжання з агнём пры спальванні смецця на тэрыторыі прыватнага домаўладання. Школьнік кінуў у вогнішча балончык з-пад фарбы, які выбухнуў у агні. Пры тых жа ўмовах быў траўмаваны яго аднагодак, але ўжо ў вёсцы Сялец Навагрудскага раёна. Пацярпелы атрымаў апёкі першай — другой ступені. Пры спальванні смецця хлопчык аступіўся, упаў у вогнішча і атрымаў апёкі рук. Па абодвух фактах праводзіцца праверка. Стан хлопчыкаў ацэньваецца як здавальняючы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


**Извещение о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62.

| Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка, срок аренды, размер начальной цены и задатка |
| --- |
| Лот № 1. Право заключения договора аренды на 10 лет земельного участка, кадастровый № 224685690601000390, площадь 0,0866 га, адрес: Витебская обл., Толочинский р-н, Кохановский с/с, г. п. Коханово, ул. Старосельская для установки и обслуживания торгового павильона. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона водного объекта (пруд), охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 В. **Нач. цена**: 2823,15 руб. **Задаток:** 282,32 руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 18.07.2018 в 15.00 по адресу: г. Толочин, ул. Ленина, 1 в Толочинском райисполкоме. **Срок внесения задатка и приема документов:** с 13.06.2018 с 8.30 по 17.07.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY84AKBB36003270095710000000, г. Минск, ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04002. Получатель платежа: ГУ МФ по Витебской области |

